Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(53), 2009

*УДК 947.6:02*

# Станаўленне сістэмы навучальных устаноў па падрыхтоўцы работнікаў для культурна-асветніцкіх устаноў савецкай Беларусі ў 20-х гг. XX ст.

А. Г. Сарока

З усталяваннем савецкай улады на тэрыторыі Беларусі ўзнікаюць новыя віды культурна-асветніцкіх устаноў: хаты-чытальні, народныя дамы, дамы селяніна, клубы і г.д. Наладжванне падрыхтоўкі работнікаў для гэтых устаноў стала адным з важных пытанняў, якія стаялі перад савецкімі і партыйнымі ўладамі. Дадзеная тэма разглядаецца ў дысертацыйным даследванні Яршовай Э. Б. [1], аднак асвятляюцца толькі 1928-32 гг. Асноўны матэрыял для вывучэння прадстаўляюць архіўныя крыніцы.

Першай спробай наладзіць навучанне кадраў для культурна-асветніцкіх устаноў стала адкрыццё 1 ліпеня 1920 г. у Магілёве Чырвонаармейскага універсітэта пры палітаддзеле 16-й арміі Заходняга фронту. Ва універсітэце рыхтаваліся як армейскія паліткіраўнікі, так і культасветработнікі для мясцовых устаноў. Слухачы займаліся на чатырох факультэтах: падрыхтоўчым, асноўным, палітасветніцкім і спецыяльным з школьным, мастацкім, сельскагаспадарчым аддзяленнямі. Адметна, што на факультэт, які займаўся падрыхтоўкай работнікаў для культурна-асветніцкіх устаноў, прымалі асоб "больш падрыхтаваных у агульным і палітычным плане" [2, л.61]. Большасць навучэнцаў Чырвонаармейскага універсітэта былі выхадцамі з Расіі, якія трапілі на тэрыторыю Беларусі пад час вядзення ваенных дзеянняў з Польшай. Напрыклад, па няпоўным дадзеным за 1922 год, з 77 слухачоў 55 былі рускімі, 14 яўрэямі, 4 палякамі, 3 латышамі і 1 беларус [3, л. 33]. У адпаведнасці з рашэннем агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦК РКП(б) Чырвонаармейскі універсітэт спыніў сваю дзейнасць у красавіку 1922 г. [4, л.48]

X з'езд РКП(б), які адбыўся у сакавіку 1921 г. у Маскве, прыняў рашэнне аб арганізацыі ў паветах палітыка-асветніцкімі аддзеламі савецка-партыйных школ. Задачай саўпартшкол аб'яўляўся выпуск "кваліфікаваных спецыялістаў па савецкаму будаўніцтву, якія б былі аснавацельна знаёмы з тэорыяй і практыкай камунізма" [5, с. 359, 453].

Па свайму тыпу саўпартшколы падзяляліся на I і II ступені. Саўпартшколы I ступені – гэта пачатковыя саўпартшколы без спецыялізацый тэрмінам навучання каля 3-х месяцаў. Такія школы павінны былі выпускаць "элементарна палітычна граматных мясцовых радавых работнікаў". Для паступлення ў саўпартшколу II ступені, якая рыхтавала партыйныя і культурна-асветніцкія кадры, неабходна была падрыхтоўка саўпартшколы I ступені. Тэрмін навучання у такой установе ўстанаўліваўся ў 1 год. Гэта школа давала "агульнае рознабаковае марксістскае развіццё, на прыродазнаўчым навуковым фундаменце, з агульнаадуацыйнымі прадметамі" [6, л. 180].

Згодна пастанаўлення X з'езду РКП(б) і па рашэнню Магілёўскага павяткома РКП(б) 6 чэрвеня 1921 г. у Магілёве была адкрыта савецка-партыйная школа I ступені з тэрмінам навучання ў 2 месяцы, якая была разлічана на 40 слухачоў [7, л. 35, 41, 69; 8, л. 196; 9, л. 22]. Аднак рэальны набор слухачоў быў павялічаны да 65 чалавек [10, л. 204].

Недахоп сродкаў і выкладчыцкага саставу не дазваляў ствараць савецка-партыйныя школы ў кожным павеце. Таму на нарадзе агітацыйна-прапагандысцкіх аддзелаў БССР ў 1921 г. было прынята рашэнне аб утварэнні савецка-партыйных школ раённага маштабу. Такія школы былі адкрыты ў Мінску (ахоплівала Мінскі, Барысаўскі, Ігуменскі паветы), Бабруйску (была прадазначана для Бабруйскага, Мозырскага, Слуцкага паветаў) [11, л. 41], Гомелі [12, с. 35].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Раённыя саўпартшколы павінны былі рыхтаваць кваліфікаваных работнікаў для вёскі і валаснога маштаба для партыйнай і культурна-асветніцкай работы. Таму школы рэкамендавалася ўкамплектоўваць з працаўнікоў, занятых на партыйнай ці савецкай рабоце на вёсцы. Адным з галоўных патрабаванняў да курсантаў школ была іх прыналежнасць да камуністычнай партыі ці камсамолу. Аднак прымаліся і тыя сяляне, што маглі, на думку мясцовай ячэйкі КП(б)Б, якая іх дэлегіравала, быць “карыснымі работнікамі” [11, л. 42].

Працягласць курса гэтых школ была ўстаноўлена ў 6 месяцаў, прычым 4 месяцы курсанты займаліся тэарэтычнымі заняткамі, а 2 месяцы адводзіліся на практычную работу. Навучанне вялося па агульнаадукацыйным (руская мова, гігіена, арыфметыка, геаграфія, прыродазнаўства) і палітычным (палітэканомія, гісторыя Расіі, гісторыя інтэрнацыянала, спецыяльны практычны цыкл) прадметам. Адметна тое, што на вывучэнне агульнаадукацыйных прадметаў адводзілася 75 % навучальнага часу, што адпавядала запатрабаванням саміх слухачоў, якія ў большасці выпадкаў мелі толькі пачатковую ці дамашнюю адукацыю.

На аснове пастанаўлення II сесіі ЦВК БССР 6-га сазыву “Аб адміністратыўна-гаспадарчым дзяленні БССР” ад 17 ліпеня 1924 г. былі ліквідаваны існаваўшыя паветы і валасці, устаноўлены падзел на акругі і раёны [13, с. 9]. Па рашэнню сакратарыята ЦК КП(б)Б ад 28 ліпеня 1924 г. Магілёўскі павятовы камітэт КП(б)Б быў рэарганізаваны [14, л. 190-196]. Адпаведна Магілёўская савецка-партыйная школа I ступені набыла статус акруговай [15, л. 52].

Якасна новы этап у навучанні ў савецка-партыйных школах назіраецца з другой паловы 20-х гадоў. Для ўпарадкавання складу навучэнцаў у школах на XIV Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі (1925 г.) былі прыняты правілы камплектавання саўпартшкол 1-й і 2-й ступені. Школы 1-й ступені былі арыентаваны на падрыхтоўку работнікаў хат-чытален, а школы 2-й ступені – сельскіх прапагандыстаў, а таксама загадчыкаў народных дамоў і хат-чытален.

У саўпартшколу 1-й ступені маглі прымацца члены і кандыдаты КП(б)Б і КСМБ ва ўзросце ад 19 да 35 гадоў, рабочыя і сяляне, якія праявілі актыўнасць у партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай ці савецкай працы. Яны павінны былі умець чытаць і пісаць па-беларуску, выконваць 4 арыфметычныя дзеянні з цэлымі лікамі і валодаць агульнапалітычнай падрыхтоўкай у аб’ёме скарочаных школ палітграматы ці вясковых школ-перасовак. Допускаўся і прыём беспартыйных у колькасці, не пераўзыходзячай 25 % усяго ліку курсантаў саўпартшколы і “прытым толькі рабочыя ад станка і сяляне ад сахі, непасрэдна рэкамендаваныя ячэйкамі КП(б)Б і КСМБ” [16, л. 81].

Патрабаванні да жадаючых навучацца ў саўпартшколе 2-й ступені былі вышэйшыя. Так, прымаліся сюды толькі члены КП(б)Б з партыйным стажам не менш 2 гадоў і члены КСМБ з камсамольскім стажам не менш 3 гадоў ва ўзросце 19-35 гадоў. Безпартыйных не прымалі ўвогуле. Для членаў партыі і камсамолу з меншым стажам і кандыдатаў было прадугледжана таксама 25-працэнтнае абмежаванне. Рабочыя і сяляне па сацыяльнаму паходжанню, кандыдаты ў курсанты саўпартшколы 2-й ступені павінны былі быць граматнымі па-беларуску і па-руску, выконваць 4 арыфметычныя дзеянні з дробамі, ведаць курс беларусазнаўства і валодаць агульнапалітычнай падрыхтоўкай у аб’ёме саўпартшколы 1-й ступені або нармальнай школы палітграматы.

Для назіраннем за выкананнем умоў прыёму ствараліся адборачныя камісіі ў складзе загадчыкаў школ, прадстаўнікоў агітацыйна-прапагандысцкіх аддзелаў ЦК КП(б)Б, акркомаў КП(б)Б, акруговых палітасветаў і жанаддзелаў [16, л. 81-82; 17, л. 329].

Для накіравання ў саўпартшколы курсантаў акруговыя камітэты КП(б)Б арганізоўвалі на месцах два віды падрыхтоўчых груп. Адны групы арганізоўваліся для асоб малаграматных па агульнаадукацыйнай падрыхтоўцы. Асаблівая ўвага тут надавалася вывучэнню беларускай мовы. Другія групы ствараліся для асоб па агульнай адукацыі і стажу грамадскай работы падыходзячых для саўпартшколы, але слабых па палітычным прадметам [18, л. 3].

У ліпені 1925 г. адбылося аб’яднанне Магілёўскай, Мінскай і Бабруйскай саўпартшкол і была створана адзіная цэнтральная саўпартшкола I ступені ў г. Магілёве [19, л. 55]. З гэтага моманту школа стала называцца Магілёўскай Беларускай савецка-партыйнай школай I ступені [15, л. 46; 20, л. 28].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Працэс станаўлення новай навучальнай установы ішоў складана. Адчуваўся вялікі недахоп у падручніках, асабліва па новаўведзеным прадметам (палітасветная праца, гаспадарчае будаўніцтва і г.д.). Да пачатку новага года не былі атрыманы навучальныя праграмы, лабараторыі былі абсталяваны не поўнасцю [21, л. 88-90].

На хвалі беларусізацыі ў рэспубліцы магілёўскай саўпартшкола была абвешчана беларускай. Таму і 70 % навучання вялося на беларускай мове. Аднак ёй не валодала частка курсантаў і выкладчыкаў, што таксама ўскладняла працэс навучання [19, л. 55].

Магілёўская савецка-партыйная школа I ступені была арыентавана выключна на падрыхтоўку нізавых працаўнікоў культасветы – загадчыкаў хат-чытален і народных дамоў. На іх ускладваліся задачы не столькі арганізацыі адпачынку, культурнага развіцця вясковага насельніцтва, колькі фарміраванне ў іх дабразычлівых адносін да новага палітычнага ўкладу ў краіне.

Савецка-партыйная школа II ступені была адчынена ў 1925 г. у Віцебску. Рыхтаваліся тут у асноўным партыйныя работнікі, прапагандысты і часткова загадчыкі хат-чытален. З 1925/26 навучальнага года было прынята рашэнне аб пераводзе апарата Віцебскай саўпартшколы на беларускую мову. Для гэтага абавязалі на беларускай мове не толькі чытаць лекцыі і праводзіць заняткі, але і забяспечыць правядзенне часткі клубнай работы (у гуртках, студыях, на клубных вечарах і г.д.) [22, л. 273].

У сакавіку 1927 года ў Мінску адбыўся Першы з’езд загадчыкаў хат-чытален, на якім разглядаліся і пытанні падрыхтоўкі нізавых работнікаў культасветы. Асноўнымі навучальнымі ўстановамі па выпуску такіх кадраў заставаліся саўпартшколы 1-й ступені. Аднак такая школа ў БССР існавала толькі ў Магілёве, што не магло забяспечыць поўнасцю патрэбы ў работніках у рэспубліцы [23,с. 16].

Адным з галоўным вынікаў стала рэарганізацыя Магілёўскай саўпартшколы ў 1928 г. у Магілёўскі палітыка-асветніцкі тэхнікум з планавай падрыхтоўкай працаўнікоў для культурна-асветніцкай сферы: загадчыкаў хат-чытален, народных дамоў, дамоў селяніна, бібліятэкараў, клубных работнікаў, раённых палітінспектараў і г.д. [24, л. 35; 25, л.152-154]

Першапачатковы праект рэарганізацыі ў тэхнікум прадугледжваў 4-х гадовы тэрмін навучання [26, л. 57]. Аднак канчаткова курс навучання ў палітасветным тэхнікуме быў вызначаны ў 3 гады. У тэхнікуме мелася 3 сектары: беларускі, польскі, яўрэйскі.

Змены адбыліся і ў арганізацыі работы савецка-партыйных школ II ступені. Так, Віцебская і Гомельская (якая да гэтага моманту рыхтавала выключна партыйныя кадры) саўпартшколы II ступені былі аб’яднаны ў 1928 г. ва Усебеларускую савецка-партыйную школу імя Ф. Э. Дзяржынскага з цэнтрам у Гомелі. [1, с. 103]. Аднак гэтая школа была накіравана ў асноўным на падрыхтоўку партыйных работнікаў і прапагандыстаў і ў меншай ступені культасветнікаў.

Навучальныя праграмы саўпартшкол увесь час змяняліся, удасканальваліся. У 1925/26 навуч. г. асобны канцэнтр ведаў, якія выкладаліся ў саўпартшколе, быў прысвечаны менавіта палітыка-асветніцкай рабоце ва ўстановах культасветы. Так, праграма “Палітасветніцкая работа для саўпартшколы 1-й ступені” складалася з 16 тэм агульнай колькасцю ў 100 гадзін. Кожная тэма прапрацоўвалася спачатку тэарэтычна, затым больш дэталёва на практыных занятках. Тэмы гэтага курса ахоплівалі розныя бакі працы хаты-чытальні: арганізацыйныя пытанні па пастаноўцы палітасветніцкай работы ў вёсцы, масавая, даведачная работа, работа з газетамі, з кнігамі, аграпрапаганда, кааператыўная, антырэлігійная прапаганда, праца гурткоў у хаце-чытальні, пытанні арганізацыі і правядзення дакладаў, гутарак, палітсудоў, экскурсій, пытанні самаадукацыі, а таксама работы сярод жанчын, піянерскі рух і ліквідацыя непісьменнасці [19, л. 100-103].

У 1925/26 навучальным годзе ў Магілёўскай саўпартшколе было адчынена польскае аддзяленне і ў план навучання ўведзены 200 гадзін на вывучэнне польскай мовы [27, л. 146]. У Віцебскай жа школе адкрылася яўрэйскае аддзяленне з дадатковымі дысцыплінамі: гісторыя яўрэйскага руху, эканамічныя і пратыйныя работы ў мястэчках, гісторыя сіанізму [27, л. 104].

Для авалодання курсантамі Магілёўскай саўпартшколы практычнымі навыкамі працы ў зімовы перыяд была арганізавана чатырохтыднёвая практыка. Усе навучэнцы школы былі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

накіраваны ў вёскі па ўсім акругам Беларусі колькасцю 5-6 асоб у кожную акругу, а ў Магілёўскую, Мінскую і Віцебскую – па 14 асоб [19, л. 31].

Праца школы II ступені была пастаўлена на больш высокі ўзровень арганізацыі. Прадметы курсантам выкладаліся з большай практычнай прапрацоўкай. Гэтаму садзейнічала і замацаванне навучэнцаў за апорнымі пунктамі: навучэнцы 1-га курса – за Домам селяніна ці падшэфнымі хатамі-чытальнямі, навучэнцы 2-га курса – за гарадскімі культурна-асветніцкімі ўстановамі (клубамі, бібліятэкамі, лікпунктамі і г.д.) [19, л. 104].

Курсанты Віцебскай саўпартшколы таксама былі ахоплены практычнай працай. Але тэрмін яе быў больш працяглы – 6 тыдняў. Першакурснікі адпраўляліся ў акругі з якіх былі прысланы і скарыстоўваліся там ў якасці працаўнікоў у хатах-чытальнях, а другакурснікі атрымлівалі больш спецыялізаваную практычную падрыхтоўку. Так, напрыклад, 14 чалавек былі накіраваны на практыку ў хаты-чытальні і народныя дамы [19, л. 42].

Згодна праграме на 1926/27 навуч. г. курсанты саўпартшкол праходзілі навучанне па тром групам прадметаў: агульнаадукацым (беларуская і руская мовы, матэматыка, прыродазнаўства), агульнапалітычным (эканамічная геаграфія, гісторыя класавай барацьбы, гісторыя ВКП(б) і ленінізму, гістарычны матэрыялізм, гісторыя Беларусі, палітычная эканомія) і спецыяльным (савецкае, гаспадарчае, пратыйнае будаўніцтва, практычная гігіена і санітарыя, праца сярод жанчын, палітасветная праца). Неабходна заўважыць тое, што на пытанні культурна-асветніцкай работы было адведзена зусім невялікая колькасць гадзін. У Магілёўскай саўпартшколе гэта лічба складала 230 гадзін з агульнай колькасці 2180 гадзін за 2 гады навучання. А ў Віцебскай саўпартшколе ўвогуле адбылося скарачэнне курсу палітасветы з 180 да 100 гадзін, што звязана было з прыярытэтам падрыхтоўкі рознага роду партыйных дзеячаў і ў меншай ступені культасветнікаў [27, л. 147-149].

У праграме навучання ў Магілёўскім палітасветтэхнікуме адбылося расшэрэнне вывучаемых прадметаў. Так, у агульнаадукацыйны цыкл было дадаткова ўведзена вывучэнне беларускай і рускай літаратуры, асноў эвалюцыйнага вучэння, фізіялогія і анатомія, фізіка, хімія. Спецыяльны цыкл быў умацаваны вывучэнем музыкі, графікі, фізкультуры з метадычнымі ведамі, дэталёвай падрыхтоўкай да летняй практыкі [26, л. 58].

Савецка-партыйныя школы дзейнічалі ва ўмовах няпоўнага забеспячэння матэрыяльнымі сродкамі, літаратурай, праграмамі, недастатковым кіраўніцтвам з боку дзяржаўных і партыйных структур. Да таго ж на вучобу пасылаліся пераважна не самыя лепшыя работнікі, без стажу грамадскай работы [12, с. 36]. Усё гэта патрабавала пастаяннага карэкціравання навучальнага працэсу ў саўпартшколах. Таму на працягу 20-х гг. XX ст. колькасць слухачоў, прынцыпы іх адбору, тэрміны навучання пастаянна змяняліся.

Так, 3 чэрвеня 1922 г. Магілёўскі павятком РКП(б) аб'явіў аб новым наборы курсантаў (з планам у 80 чалавек) для паступлення ў саўпартшколу, якая была разлічана на 4 месяцы навучання [4, л. 73].

З кастрычніка 1923 г. пачаўся чарговы навучальны год у Магілёўскай павятковай саўпартшколе I ступені. Навучальны год быў разлічаны ўжо на 8 месяцаў і дзяліўся на 3 трыместры: першы трыместр цягнуўся 12 тыдняў, другі – 14, трэці – 9 тыдняў, а ў прамежку паміж трыместрамі – два перарыва для практычных работ і адпачынку курсантаў. Колькасць курсантаў складала 136 чалавек (у тым ліку 16 жанчын), з іх 37 членаў партыі, 31 кандыдат у члены пратыі, 39 камсамольцаў, 29 безпартыйных. [28, л. 10-13].

У 1924/25 навучальным годзе Магілёўскай акруговай саўпартшколай было набрана 64 курсанта. Навучальны год дзяліўся на 2 семестры – з 3 кастрычніка па 15 студзеня і з 1 сакавіка па 20 чэрвеня. З 7-мітыднёвага перапынку паміж семестрамі 5 тыдняў было адведзена на практычную работу курсантаў па раёнам Магілёўскай акругі [15, л. 52].

Заняткі ў саўпартшколах ў 1926/27 навучальным годзе пачаліся 15 верасня і заканчваліся 15 чэрвеня з 8-тыднёвым перапынкам на практычную працу і адпачынак ў зімовы перыяд. Спробай надаць большы практычны характар навучанню было і ўвядзенне абавязковых 12 гадзін ў тыдзень для практычнай пазашкольнай працы [27, л. 146]. Навучалася ў Магілёўскай саўпартшколе I ступені 238 чалавек [29, л. 9], у Віцебскай саўпартшколе II ступені – 166 [30, с. 16].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адзначаючы значны недахоп кадраў для культурна-асветніцкіх установаў у рэспубліцы партыйныя органы патрабавалі забяспечыць павышэнне колькасці слухачоў у саўпартшколах. І хаця захады для гэтага прымаліся (у параўнанні з папярэднімі гадамі ў 1926 годзе працэнт прынятых курсантаў павялічыўся на 9, а ў 1927 – яшчэ на 12), аднак калегія агітацыйна-парпагандысцкага аддзела ЦК КП(б)Б прызнала невыкананымі дырэктывы па ўкамплектаванню саўпартшкол, а працэнт павелічэння – "нязначным" [31, л. 217].

У 1929/30 навуч. г. ў Магілёўскім палітасветтэхнікуме навучалася ўжо 316 студэнтаў: на 1-м курсе – 122 чалавека, на 2-м – 98, на 3-м – 96 чалавек [32, л. 24].

Тормазам у рабоце саўпартшкол з'яўляўся падбор слухачоў. Значная іх частка была зусім слабая ў падрыхтоўцы і не магла засвоіць праграму навучання. Так, напрыклад, у пратаколе паседжання калегіі АПО Мінскага павяткома КП(б)Б у чэрвені 1924 года было адзначана, што з 57 курсантаў Мінскай саўпартшколы толькі 30 чалавек "будуць добра падрыхтаваны" [33, л. 13].

У наступныя гады надзялялася большая ўвага адбору навучэнцаў для школ. Так, адразу на другі курс цэнтральнай Магілёўскай савецка-партыйнай школы з трох былых саўпартшкол былі прыняты 57 курсантаў, якія паказалі лепшыя вынікі навучання. Для паступлення на першы курс з мясцовых палітасветкомаў было камандыравана 158 чалавек, аднак прыёмнай камісіяй 44 заяўкі было адхілена [19, л. 55].

Аб тым, што адміністрацыя саўпартшкол цікавілася не толькі агульным узроўнем падрыхтаванасці курсантаў, а таксама іх сацыяльным паходжаннем і прыналежнасцю да камуністычнай партыі ці камсамолу, сведчаць лічбы, якія адлюстроўваюць галоўныя крытэрыі падбору слухачоў.

Так, новы набор 1925/26 г. быў, як адзначалася ў справаздачы Магілёўскай школы, "добры па сацыяльнаму стану і прысутнасці ў мінулым практычнай працы, але параўнаўча слабы ў агульна-адукацыйным плане" [19, л. 55]. У школе навучалася па сацыяльнаму становішчу 98 сялян, 52 рабочыя, 24 батракі, 3 служачых. Акрамя 10 чалавек, усе курсанты належылі да КП(б)Б і КСМ. Да паступлення ў школу 24 слухачы працавалі загадчыкамі хат-чытальняў, астатнія займалі розныя пасады ў сельскіх саветах, ячэйках КП(б)Б і КСМ і інш. [34, л. 90; 21, л. 91]

Па звесткам аб укамплектаванні Магілёўскай саўпартшколы ў 1927/28 навучальным годзе сярод 115 залічаных курсантаў 65 былі з сялянскага асяродку, 24 з рабочага, 21 з батракоў і 5 з сямей служачых. Толькі 5 чалавек з'яўляліся беспартыйнымі, астатнія ж былі членамі і кандыдатамі КП(б)Б і ЛКСМБ. Па ўзросту пераважная большасць – 110 чалавек – не дасягнулі 30 гадоў. Нацыянальны склад курсантаў: 76 беларусаў, 23 палякі, 8 яўрэяў, 6 рускіх і 2 чалавека іншых нацыянальнасцей [31, л. 220].

Пасля праходжання тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі ў савецка-партыйных школах выпускнікі атрымоўвалі накіраванні на працу ў культурна-асветніцкія ўстановы рэспублікі. Напрыклад, выпускнікі саўпартшкол у 1925/26 годзе былі размеркаваны на працу наступным чынам: з 56 выпускнікоў Магілёўскай саўпартшколы на пасаду загадчыкаў хат-чытален і народных дамоў было адпраўлена 43 чалавека; з Віцебскай саўпартшколы на культурна-асветніцкую працу было накіравана толькі 4 чалавека (8 % ад агульнай колькасці выпускнікоў) [19, л. 372].

Са 100 выпускнікоў Магілёўскай саўпартшколы ў 1928 г. рады загадчыкаў хат-чытален папоўніў 71 курсант, загадчыкаў і працаўнікоў народных дамоў – 19 чалавек [26, л. 84а].

Выпускнікі Магілёўскага палітыка-асветніцкага тэхнікума складалі асноўную крыніцу папаўнення культурна-асветніцкіх установаў кваліфікаванымі кадрамі. Так, пасля размеркавання 95 выпускнікоў Магілёўскага тэхнікума ў 1928/29 навуч.г. 82 чалавека было накіравана на працу загадчыкамі хат-чытален, народных дамоў. У той жа час са 141 слухача Усебеларускай савецка-партыйнай школы II ступені на такія ж пасады было адпраўлена толькі 42 культасветніка [35, л. 530].

Такім чынам, на працягу 20-х гадоў XX ст. у Савецкай Беларусі адбываўся працэс фарміравання сістэмы навучальных установаў, для падрыхтоўкі ў іх работнікаў культасветус-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

таноў. Галоўнымі ўстановамі гэтага накірунку сталі савецка-партыйныя школы I і II ступені, а з 1928 г. – Магілёўскі палітыка-асветніцкі тэхнікум. Установы давалі не толькі тэарэтычныя агульнаадукацыйныя, палітычныя і спецыяльныя веды, але і прадстаўлялі магчымасць навучэнцам атрымоўваць практычныя навыкі. Аднак поўнасцю задаволіць патрэбнасці ў культурна-асветніцкіх кадрах гэтыя ўстановы не маглі, што і выклікала неабходнасць склікання кароткатэрміновых падрыхтоўчых курсаў.

**Abstract.** This paper considers the origin and development of training institutions for cultural and educational workers in Soviet Belarus in the 20ies of the 20-th century. Soviet party schools became the main type of such institutions. The paper contains the analysis of curricula, school training plans, and students classification.

### Літаратура і крыніцы

1. Ершова, Э. Б. Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по подготовке и воспитанию кадров для культурно-просветительных учреждений в годы первой пятилетки (1928-1932 гг.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.01/ Э. Б. Ершова. – Минск, 1979. – 197 с.
2. Государственный архив общественных объединений Могилёвской области (ГАООМО). – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 105.
3. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 42.
4. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 145.
5. КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК: в 6 ч. / Рэдакцыя палітычнай літаратуры. – 7-е выд. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1954. – Ч. 1: 1898–1924 гг. – 1954. – 828 с.
6. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 221.
7. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 73.
8. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 100.
9. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 143.
10. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 157.
11. Государственный архив Минской области. – Фонд 324. – Оп. 1. – Д. 149.
12. Шалыгинова, Е. Работа совпартшкол на местах / Е. Шалыгинова // Коммунистическое просвещение. – 1922. – № 1. – С. 35-37.
13. Административно-территориальное устройство БССР: справочник: в 2-х т. / Гл. арх. упр. при Совете министров БССР; сост. Т. А. Воробьева [и др.]. – Минск: Беларусь, 1985. – Т. 1: 1917–1941. – 1985. – 390 с.
14. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 902.
15. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 141.
16. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 48.
17. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 19.
18. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 47.
19. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 55.
20. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 428.
21. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 228.
22. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 54.
23. Рэзалюцыі першага ўсебеларускага з'езду ізбачоў (14-18 сакавіка 1927 г.). – Мінск: Галоўпалітасветы БССР, 1927 г. – 76 с.
24. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 156.
25. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 595.
26. ГАООМО. – Фонд 6625. – Оп. 1. – Д. 303.
27. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 50.
28. ГАООМО. – Фонд 6622. – Оп. 1. – Д. 470
29. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 592.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

30. Баліцкі, А. Народная асвета БССР / А. Баліцкі // Асвета. – 1926. – № 7. – С. 5-19.
31. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 123.
32. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 845.
33. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 32.
34. ГАООМО. – Фонд 6577. – Оп. 1. – Д. 222.
35. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 127.

Беларускі дзяржаўны педагагічны
універсітэт імя Максіма Танка

Поступило 05.12.07

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ